№ 16 (45) Нядзеля 22-га траўня 1927 г. м. Вільня. Год II.

Беларускае Слова

Выходзіць раз у тыдзень

Цана нумару 20 грош.

Нацыянальнае адрадж... ...ая і культурна-нацыянальная аутаномія.—Зямля сялянам на падставе уласнасьці.—Шырок. дэмократызм.—Бар... ...ая царква.—Краевая згода. Далучэньне Усходняй Беларусі да Заходняй.

Падпісная цана на ... Заграніцу ўдвая даражэй.

...Адміністрацыі: Wilno ul. Zawalna 6 m 4 ...на ад 12—2 гадз. штодня апрача сьвятаў.

Цана абвестак: перад тэкстам—20 гр.
„ сярод тэксту —25 гр.
„ на апош. стар.—10 гр.
за радок нонпарэля.

Белы—Чырвона—Белы.

Зьявішчам бязспрэчным ёсьць разьвіцьцё ўва ўсім сьвеце Нацыянальнай Ідэі.

У некатарых народах гэтая ідэя ня толькі разьвілася, яна запанавала і мы бачым, як каля гэтай ідэі злучаецца народ, а злучаны аб'еднаны дапяў свае вышэйшае мэты — незалежнасьці. Гэтак стала з Эстоніяй, Латвіяй Літвой, Фінляндыяй, Польшчай. Калі ўсе гэтыя народы ўваскрэзалі для новага жыцьця, ім прысьвячвала адна ідэя—Нацыянальная. Ня было тады паміж імі ні клясовай барацьбы, ні падзелу на партыі. Праўда ўжо маючы свае ўласныя дзяржавы народы гэтыя ўнутры падзяліліся на партыі. але тагды, калі яшчэ яны ня мелі сваіх дзяржаваў, не было змаганьня на сьмерць эндэкаў з пэпээсамі і г. д. Яны ўсе згодна і разам йшлі плячо к плячу, будуючы Дзяржаву, як адзін клалі жыцьцё, калі Варшаве гразіла пагібель.

Нам беларусам трэба вучыцца браць прыклад з гістарычных падзеяў, якія адбыліся на нашых вачох. Але ў нас замест еднасьці разнабой, заместа згоды—барацьба і змаганьне. І гэта ўсё з тае прычыны, што ў нас не дасьпела ідэя Нацыянальная. Мы маем соймавыя партыі: клясовую, сялянскую, пралетарскую, нарэшце з ідэолёгіяй хрысьціянскай, але мы ня мелі і ня маем партыі нацыянальнай Мы яшчэ нічога нацыянальнага, свайго ўласнага не збудавалі і ўжо пабіліся на партыі, якія ніяк ня могуць аб'еднаць каля сябе *ўсяго* народу, бо яны баронуць інтарэсы толькі пэўнай групы насяленьня, — пэўную клясу.

Жыцьцё дыктавала, каб гэткая партыя была створана. Жыцьцё змушала, каб усе шчырыя беларусы, ці то селянін бедняк, ці селянін заможны, ці работнік, ці інтэлігэнт ці духоўны, жадаючы будаваць Беларусь, йшлі бы пад нейкі *адзіны сьцяг* Гэтым сьцягам ёсьць не чырвоная шмата Грамады, не зялёна-чырвоны сьцяг Сельсаюзу - ім ёсьць сьцяг наш гістарычны *нацыянальны Бела—Чырвоны — Белы Сьцяг*! І гэтак сталася, што гэты сьцяг 11 месяцаў назад высока і выразна падняла Беларуская Нацыянальная Рада. За гэты год многа беларускай вады пранясло. Паўстала і заліла сваімі к мс - мольскімі гурткамі беларускія землі Грамада. Усе высілкі, усю ненавісьць і сваю магутнасьць яна перад усім скіравала, каб наш Бела — Чырвона — Белы сьцяг сарваць, зьніштожыць і зьмяніць на чырвоную інтэрнацыянальную шмату з комуністычнай зоркай І мала было рук трымаўшых наш сьцяг, але крэпкія гэта былі рукі, глыбокая вера і любоў да Бацькаўшчыны прыдавалі яшчэ больш сілы і крэпасьці трымаўшым Нацыянальны Сьцяг.

І сяньня праз нясканчаны год, мы бачым, як каля нашага сьцяга гуртуюцца не адзінкі, не дзесяткі, а сотні і тысячы гэткіх жа цьвёрдых і шчырых патрыётаў, як і тыя першыя піонэры.

Народ беларускі зразумеў, гдзе яго мейсца, якім шляхам яму трэба ісьці і ўва ўсіх кутках беларускіх паўстаюць аддзелы Бел. Нацыянальнай Рады, пішуцца асобы і групы ў сябры свеей нацыянальнай арганізацыі Друкаваная ніжэй заява камітэту вызваленцаў з 1200 сяброў ёсьць адным з выпадкаў лучэньня да Бел. Нац. Рады. Гэтая прачнуўшая сьвядомасьць ёсьць найдаражэйшай нагродай для тых, хто ў самыя цяжкія гадзіны вытрываў на сваім пасту, не ўпаў і не здрадзіў сваей Ідэі. Усе вышэй уздымаецца наш нацыянальны сьцяг, усё ярчэй блісьцяць колеры, усё больш шчырых аддаnых сваей Бацькаўшчыне патрыётаў зьбірае Ен.

Рэдакцыя і Адміністрацыя „Беларускага Слова"

гэтым паведамляюць карэспандэнтаў і падпісчыкаў аб перамене свайго адрасу.

Падпіску і ўсю карэспандэнцыю трэба кіраваць па гэткаму адрасу:

Wilno, Zawalna 6, m. 4.

Рэдакцыя і Адміністрацыя „Беларускага Слова".

Пісьмо Вызваленцаў да Беларускай Нацыянальнай Рады.

Да Пана Старшыні Беларускай Нацыянальнай Рады.

Гэтым Управа Палачанскага Гміннага Гуртка П. Н. Ц. „Вызваленьне" просіць Вас аб распараджэньні выслаць для азнаямленьня поўны камплект Вашай літэратуры на імя Старшыні Гуртка Пятровіча Адначасна паведамляем Вас, што наш гурток складаецца з тысяча двухсот шаснадцаці (1216) сябраў „Вызваленьня" і ня гледзючы на нашую стойкую барацьбу, за апошні час Грамада значна падарвала аўтарытэт „Вызваленьня" ў Заходняй Беларусі. Апрача таго і само „Вызваленьне" скампрамітавала сябе бо ў Сойме ані воднага абецанага для Беларусаў перад выбарамі ў Сойм, праэкта не ўнясло для палепшаньня долі працоўнага беларускага народу, ды яшчэ разам з іншымі польскімі партыямі галасавала за асаднііцтва вайсковае на „Крэсах". Дзеля гэтага *ўсе беларусы* — вызваленцы маюць намярэньне пакінуць „Вызваленьне" *і прымкнуцца к сваей Нацыянальнай Дэмакратычнай Беларускай Арганізацыі.*

З поўнай пашанай да Вас

М. Пятровіч

Старшыня, б інструктар Акружны Віленшчыны і Наваградчыны P. S. L. Wyzwolenie

Скарбнік — **Белан Макар.**

Палітычны агляд.

У той час, калі бальшавікі думалі, што Эўропа прыме з ростапыранымі аб'яцьцямі іх прапазыку эканамічнага супрацоўніцтва, крывадушны Альбіён паднёс

новы сюрпрыз бальшавікам.

Мы маем на ўвазе вобыск у лёнданскім радавым кааперэтыве „Аркос", існуючым пры радавым гандлёвым прадстаўніцтве. Гэтая аплявуха, нанесеная бальшавікам у тым часе і мейсцы, у якім яны менш усяго чакалі, зрабіла шмат мацнейшае ўражаньне, чым пэкінская, нанесеная Чан-Со-Лінам. Гэты крок Англіі зьяўляецца бязумоўна безпасрэднім вынікам кітайскага паражэньня бальшавікоў і далейшым працягам англійскай антыбальшавіцкай акцыі, перанесенай з Азіяцкага грунту на Эўрапэйскі.

Гэткім чынам нашы меркаваньні ў папярэднім „палітычным аглядзе" аб тым, што Англія спыніла барацьбу з бальшавікамі і працягвае ім руку згоды, аказаліся крыху пасьпешнымі.

Англія прадаўжае барацьбу з бальшавізмам,

і лёнданскім вобыскам кінула Маскве рукавіцу вызаву. Але апошняя, як ведамы трус, працуючая толькі шляхам агідных подкупаў, ашуканстваў і правакацыі, не падняла гэткай рукавіцы. Акурат як і пасьля пэкінскай аплявухі бальшавікі адкрыта дэманструюць сваё абурэньне, інспіруюць у Маскве і іншых расейскіх местах масовыя пратэсты, але кіраўнікі радавай улады заяўляюць, што „Англіі ня ўдасца справакаваць бальшавікоў і штырхнуць іх на неразважныя крокі". Пад гэтымі славамі яны маюць на ўвазе свае „міралюбівыя імкненьні" пасьля таго, як ім пачалі нанасіць адну за другою аплявухі па абодвым шчакам. Нават бальшавікі ня пужаюць Англію разрывам гандлёвых адносінаў, як гэта часта здаралася раней, а толькі пагражаюць, што значную частку тых заказаў, якія былі праднaзначаны для Англіі, будуць скіраваны да іншых дзяржаваў.

Адсюль відаць, што англічане аказаліся ня меншымі псыхологамі, чым самі бальшавікі. Яны добра раскусілі іх і рашылі нарэшце аканчальна

скампрамітаваць перад усім сьветам і ўласнымі капіталістамі,

якія рыхтаваліся выдаць бальшавікам грашавую пазыку ў разьмеры 10 мільёнаў фунтаў штэрлінгаў. Як — ні — як гэта вельмі паважная сума грошаў — 100 мільёнаў руб. — значная частка з якіх пайшла бы на барацьбу з Англіяй-жа, каб англійскі ўрад з лёгкім сэрцам згодзіўся на гэтую зьдзелку. Калі мы прыпомнім, дык нябошчык Кэрзан, гэтак сама скампрамітаваў бальшавікоў з памятным пісьмом Зіноўева да англійскіх жаўнераў і матросаў. Як раз у той час, сацыялістычны ўрад Макданальда рыхтаваўся да падпісаньня з Радамі гандлёвага дагавору, пасьля чаго апошнія мелі атрымаць грашовую пазыку. Аналёгія ў гэтых абодвых выпадках поўная. І вынікі павінны быць аднальковыя.

Каб скрыць уражаньне азіяцкага паражэньня, бальшавікі адразу прыкінуліся нявіннымі баранчыкамі і прапануюць у Жэнэве гаспадарчае супрацоўніцтва з капіталістычным сьвегам, ведаючы добра слабасьці апошняга. І калі-б толькі бальшавікам пашанцавала атрымаць ад англійскіх банкіраў пазыку, гэта значна падняла бы іх аўтарытэт у Зах Эўропе. Яны прадставілі бы гэта так, што ні яны сталі сталі на заднія лапы перад Англіяй, а што апошняя патрабуе дружбы і гандлю з бальшавікамі. А ўсьпех у Англіі ў сваю чаргу аблягчыў бы бальшавікам іх акцыю паводле новай тактыкі і ў іншых заходня-эўрапэйскіх дзяржавах. Між іншым гэта зрабіла бы свой уплыў і на далейшы ход перагавораў з Францыяй, якія ўпёрліся ў тупік. Ізьлюбленай тактыкай бальшавіцкай дыплёматыі заўсёды была

ігра на узаемнай канкурэнцыі між Англіяй і Францыяй.

Як Эррыё з Макданальд падпісалі згоду адносна згоды крокаў у адносінах бальшавікоў, гэта тактыка ня мела карысных вынікаў. І цяпер якраз прадстаўляўся для бальшавікоў апошні мамэнт, калі яны маглі з усьпехам скарыстаць гэны прыём. Вось дзеля чаго кіраўнік бальшавіцкай дэлегацыі на Жэнэўскай канфэрэнцыі вельмі размалёвываў памыснасьць радава — французскіх перагавораў, у якіх быццам ужо дасягнута прынцыповая згода па ўсім паважнейшым пытаньням. Хаця калі-б было гэтак, дык Чычэрын ня ўцёк бы маўчком з Францыі, ня заглянуўшы нават у Парыж На гэты раз Англія перайшла нават сама сябе. Ня толькі не пазволіла бальшавікам шукаць сябе грушкамі на вербе і выклікаць зайздрасьць фліртам з Францыяй, але нават сама выступіла з контр-акцыямі. Лёнданскі вобыск, які бязумоўна дасьць вельмі цэнныя доказы бальшавіцкай антыдзяржаўнай працы ў Англіі, будзе найлепшым

сюрпрызам для Думэрга і Брыяна,

прыбыўшым да Англіі Між усімі пытаньнямі, якія будуць закрануты ў асабістай размове французскага прэзыдэнта рэспублікі Думэрга і кіраўніка замежнай палітыкі Брыяна з англійскімі кіруючымі сфэрамі, гэты факт займе адно з першых мейсц. Апрача таго гэта зробіць больш сьмелай французскую нацыянальную прэсу, якая ўвесь час вядзе энэргічную акцыю проці згоды з бальшавікамі, што паважна пагражала бы ўнутранай небясьпецы Францыі ў зьвязку з ажывіўшайся антыдзяржаўнай працай французскіх комуністаў.

Адначасна пашыраецца антыбальшавіцкі рух у Расеі. Асабліва заметны

рост нацыянальнага руху,

скіраванага проці Масквы. Творачы гэтак званыя „Незалежныя Рэспублікі" на сваіх граніцах, бальшавікі мелі на мэце толькі дурачыць заграніцу, у сутнасьці не даючы ніякай нацыянальна-адміністрацыйнай вольнасьці „вольным рэспублікам" у межах С.С.Р.Р. Але жыцьцё не разумее ніякіх кпін над ім і пракладае сабе шлях па прадвечным законам гісторыі. На Каўказе, у Туркестане, на Украіне і Беларусі нацыянальны адраджэнскі рух прыняў на столькі паважны характар, што крэмлеўскія дыктатары пачалі біць трывогу. У Менску звольнілі старшыню рады беларускіх народных камісараў Адамовіча, вызначыўшы на яго мейсца нейкага тыпа з Петраграда, ня маючага нічога супольнага з Беларусьсю і беларускім народам і прыступілі да рэарганізацыі і пераmтасовак чырвонай арміі на Заходняй граніцы. Калі нават бальшавікі хвілёва і задушаць нацыянальны рух на Беларусі і Украіне, як яны затапілі ў крыві адраджэнскі рух Грузіі і Туркестана, дык гэта не ўзмоцніць бальшавіцкага рэжыму ў Расеі, які ўжо ўсім абрыд. А галоўнае—што бальшавікі выпускаюць з рук усе козыры для заграңічнай агітацыі. З якім сумленьнем яны могуць выступаць у абароне нацыянальных меншасьцяў, напрыклад у Польшчы у той час, калі яны уціскаюць і зьдзекуюцца над сваімі „незалежнымі рэспублікамі"? Але здаецца, пасьля добрай навукі, атрыманай у Кітаі, бальшавікі пакуль ня маюць дужай ахвоты да „нацыянальнага вызваленьня прыгнятаных народаў".

Што датычыцца кітайскіх падзеяў, дык там пасьля хвілёвага зацішша

ажывілася ваенная акцыя на ўсіх фронтах.

Перш-на-перш вядзецца канцэнтрычнае наступленьне з Поўначы і Усхода проці комуністычнага Ханькоў, які знаходзіцца напярэдадні ўпадку. Кітайскія комуністы апынуліся ў вельмі цяжкай сытуацыі, адрэзаныя ад вонкаваго сьвета і пазбаўленыя грашовай дапамогі з боку Масквы У самым Ханькоў расьце незадаваленьне сярод працоўных і сялян, а армія раскладаецца. На кітайскім тэатры вайны ізноў выступілі гэн. Ву-Пэи Фу, былы хаўрусьнік Чанг-Тсо-Ліна, які вядзе наступленьне проці Хянькоў, і Фэнг, пачаўшы наступленьне 4 калоннамі на шырокім фронце проці Пэкіна ад Манголіі. Гэн. Шэк вядзе адначасна наступленьне проці Ханькоў і Чанг-Тсо-Ліна. Дзеля гэтага німа нічога цікавага, што


вялікія дзяржавы займаюць пазыцыю вычаканьня ў Кітае

Нядаўна новы міністар замежных справаў Нанкінскага ўраду Ву выступіў з заявай, у якой дамагаецца ад Злучаных Штатаў скасаваньня крыўдзячых Кітай трактатаў. Дзяржаўны сэкрэтар Злучаных Штатаў Келаг адказаў, што яго ўрад прынцыпова згаджаецца з тым, каб усе ранейшыя ўмовы з Кітаем былі перагледжаны, але ня мае замеру прыступаць да перагавораў ні з адным з цяперашніх кітайскіх урадаў, пакуль адзін з іх ня будзе прадстаўляць большасьці аб'яднанага Кітаю. Зусім аналёгічную пазыцыю займае і Англія, пакуль ня выясьніцца палітычная сытуацыя ў Кітаі

N.

Пашырайце роднае слова!

Вайна у Кітаі.



Апошнімі днямі прыходзяць весткі аб нанова разгарэўшайся вайне ў Кітаі. Гэнэралы Чанг-Тсо-Лін са стараны Пэкіна і Чан-Кай-Шэк са стараны Шанхаю ўзаемна змагаючыся наступаюць на комуністычны Ханькоў. У сваю чаргу бальшавіцкі гэнэрал Фэнг з Манголіі маніцца наступаць на Пэкін.

Апошнія навіны.

У Польшчы.

ВЫБАРЫ Ў РАДУ м. ВАРШАВЫ Сьпісак № 10, на якім падпісаліся комуністы, па распараджэньню Галоўнага Выбарнага Камісара ўневажнены.

ВЯЛІКІ ПАЖАР НА ЎСХОДНІМ ВАГЗАЛЕ Ў ВАРШАВЕ. 13 г. траўня раніцай каля гадзіны 7-ай загарэліся мэханічныя варстаты на ўсходнім вагзале ў Варшаве. Пажар узьняўся ў лякерні, дзе знаходзілася 22 вагоны I і II клясы.

Усе вагоны згарэлі да-чыста, як уся лякерня. У сувязі з гэтым арыштавана некалькі асобаў сярод чугуншчыкаў.

НЯМЕЦКІЯ КРЭПАСЬЦІ РАЗБУРАНЫ. Работы над разбурэньнем нямецкіх крэпасьцяў на Усходняй граніцы, як паведамляюць амаль што скончаны; зьнішчаны ўкрапленьні ў Глогаве і Кістрыне. У Каралеўцу будуць зьнішчаны ў працягу траўня.

ПАВЕТРАНАЯ КАТАСТРОФА. У Варшаве 11 г. траўня, а гадзіне 9 раніцай зваліўся на Бэльвэдэрскі сад, палкоўнік Зых-Пладоўскі разам са сваім аэраплянам. Палкоўнік панёс сьмерць на мейсцы.

За граніцай.

ВЫКРЫВАЮЦЬ. 12 г. месяца англійская паліцыя зрабіла рэвізію ў памешканьні савецкага каапэратыву „Аркос" у Лёндане.

Ужо аддаўна лічылі, што Савецкая гандлёвая дэлегацыя зьўляецца асяродкам комуністычнай пропаганды ў Лёндане. Калі дом, дзе быў „Аркос" быў акружаны паліцыяй, некаторыя ўрадоўцы прабавалі паліць паперы, чаму перашкодзіла паліцыя. Знойдзены доказы, што ў гандлёвай савецкай місіі працавала некалькі сотняў урадоўцаў і што быў тутака асяродок бальшавіцкай агітацыі Англійская газэта „Times" піша, што ў памешканьнях „Аркос" знайдзена так шмат комуністычнай прапагандняй літэратуры, а таксама фільмаў, што за цэлы дзень ня можна было нават усяго прагледзіць.

Прадстаўнік ураду падаў 16 г. траўня справаздачу ў Палату Вокругаў аб вобысках. Лёнданскія газэты падаюць весьці аб знойдзеных вельмі компромітуючых савецкую дэлегацыю дакумэнтаў, якія высьветляюць, што савецкая пераваротная арганізацыя была шырока расьцягнута па ўсей Англіі.

Газ. „Daily Maily" паведамляе, што па знайдзеным дакумэнтам відаць, што „Аркос" меў сувязь з Масквой; як цьвердзяць некатарыя газэты афэра „Аркоса" давядзе да зрыву афіцыяльных адносінаў паміж СССР і Англіяй.

З лёнданскіх паліцыйных кругоў прыходзяць весьці, што як выясьнілася; савецкі ўрад быў ініцыятарам забойства Петлюры.

НАПАД НА МІЛЮКОВА. З Рыгі паведамляюць, што у часе, калі Мілюкоў, вядомы расейскі дзеяч, чытаў лекцыю нехта Адэркас ударыў яго па твары. Адэркаса арыштавалі.

ГІНУЦЬ ЛЯТУЦЕНЬНІ АБ СУСЬВЕТНАЙ РЭВАЛЮЦЫІ. Францускі дэлегат на эканамічную канфэрэнцыю ў Жэнэву Жуо сказаў прадстаўнікам прэсы, што прызнаньне савецкім дэлегатам Асінскім двух сыстэмаў сусьветнай гаспадаркі капіталістычнай і комуністычнай, а таксама тое, што абодве сыстэмы могуць ужывацца даказвае, што бальшавікі не адмаўляюцца ад сваей ідэі сусьветнай рэвалюцыі:

Прапазыцыі пастаўленыя саветамі на канфэрэнцыі амаль што не саўсім згаджаюцца з праграмай сацыялістаў у Бэрне 1919 года.

КОМУНІСТАЎ, ШТО РАЗ ТО БОЛЕЙ ВЫКРЫВАЮЦЬ. З Рыгі паведамляюць, што сьледчыя ўлады скончылі сьледства ў справе 5 сяброў прафэсыянальных саюзаў у Рызе. Як аказалася ўсе яны былі супрацоўнікамі тутэйшага савецкага внешторгу і абвінавачаваюцца у дзяржаўнай зрадзе.

ПРОЦІБАЛЬШАВІЦКАЯ ЛІГА НА БАЛКАНАХ. У Бухарэсьце адбылася канфэрэнцыя прадстаўнікоў палітычнай паліцыі Турцыі, Баўгарыі, Грэцыі, Румыніі і Югаславіі. На канфэрэнцыі гэтай абгаварывалася справа супольнай барацьбы з комунізмам у Балканскіх краінах. Як цьвердзяць, канфэрэнцыя вырашыла залажыць у Бухарэсьце цэнтральны пункт, у якім будзе зьбірацца матэрыял аб дзейнасьці бальшавікоў і прыймацца меры барацьбы з імі.

ЧАГО ХОЧА С.С.Р.Р. Як паведамляюць з Лёндана С.С.Р.Р. на эканамічнай канфэрэнцыі дабіваецца: 1) залажэньня сапраўдных пасольстваў у Маскве і Лёндане 2) урэгуляваньня пытаньня аб англійскіх крэдытах.

РУМЫНІЯ РОБІЦЬ КОНКОРДАТ З РЫМАМ. З добра асьвядомленых палітычных кругоў паведамляюць, што Румынія скора зробіць конкордат з Рымам.

МАНАРХІСТЫЧНЫ ПЕРАВАРОТ У ГРЭЦЫІ. Паводле франц. газэты „Le Matin" у Грэцыі наступіла рэвалюцыя і ідзе барацьба паміж урадавым войскам і манархістамі. Сцьвердзіць гэтую вестку пакуль што не ўдалося.

КАНФЭРЭНЦЫЯ МАЛАЙ АНТАНТЫ. Як пішуць з Прагі ў Яхімове адбылося чарговае паседжаньне Малой Антанты.

Міністар румынскі Мітілінё сказаў, што Малая Антанта будзе прыхільнай да Фр н цыі і Польшчы. Румынія замерываецца таксама пагадзіць Югаславію з Італія.

Наступная канфэрэнцыя Малай Антанты зьбярэцца ўвосень 1928 года ў Бухарэсьце.

Падзеі у Кітаі.

Вайна.

Места Пу-Ку проціў Нанкіну 15 г. месяца заняў Чанг-Кай-Шэк.

У Нанкін прыбыла вялікая колькасьць раненых з поля бітвы пад Ханан. У Гонг-Конг прыбылі 4 батальёны англійскай пяхоты з мэтай узмацаваць вайсковыя сілы на далёкім Усходзе.

Дыктатура Чанг-Тсо-Ліна.

З Пэкіна надходзяць весьці, што цяпер ідуць вялікія баі паміж войскам паўночным і комуністамі.

У Пэкіне скора зьбяруцца павадыры паўночнага войска з мэтай выбару галоўнага павадыра. У гэтым самым часе будзе агалошана дыктатура Чанг-Тсо-Ліна.

Розныя весткі.

Лёт праз Атлантыцкі акіян. — Прапаўшыя лётчыкі.

Уся Францыя і ўвесь Парыж ня могуць дачакацца пэўных вестак аб прапаўшых лётчыках, якія як мы пісалі ў папярэднім нумары выляцелі з Францыі да Амэрыкі.

Некалькі дзесяткаў амэрыканскіх караблеў выправілася на шуканьне.

Пабярэжны амэрыканскі карабель, які шукаў па моры лётчыкаў, прынёс весьці, што з нядзелі на панядзелак (з 8 на 9 траўня) на моры шалела сьнежная бура, была густая імгла. Марскія ўрады Злучаных Штатаў, Францыі і Англіі разаслалі радыё тэлеграмы да ўсіх караблёў, якія ў тым часе знаходзіліся на моры, каб яны надсылалі весткі, якія здарыцца зацеміць.

Пералёт амэрыканскага лётчыка Бэлянса з Новага-Ерку да Парыжа адлажылі да высьненьня справы французскіх лётчыкаў.

Бура над Балтыцкім морам.

З Рыгі паведамляюць, што 10 г. месяца тутака шалела такая страшная бура, якой яшчэ ня было праз усю апошнюю зіму. На Дзьвіне прапала каля 50 вялікіх лодак. Лучнасьць тэлефонная паміж Талінам, Коўнам і Лібавай прарвана.

Комуністычны шпік.

У Францыі ўлада бясьпечнасьці арыштавана нейкага Комэлена які раней быў радцам места Сэн-Сір. Арыштаваны прызнаўся, што здабываў розныя ведамасьці тайнага характару ад работнікаў вайсковых варштатаў у Сэн Сір. Кіраўнік гэтых варштатаў пасьведчыў, што відзеў Комэлена, як ён хадзіў да савецкай Амбасады ў Парыжу.

Зьезд нямецкіх стальгэльмаўцаў.

8 г. месяца у Бэрліне адбыўся зьезд нямецкіх стальгэльмаўцаў. Лік зьехаўшыхся дэпутатаў перайшаў за 50 тыс. Стальгэльмаўцы ўстроілі вялікую дэманстрацыю, пелі патрыятычныя песьні і аддалі чэсьць палёгшым на апошняй вайне. Комуністы стараліся перашкодзіць дэманстрантам; паліцыя некалькі разоў разбараняла абедзьве партыі.

У С. С. Р. Р

Нэрваваньне сярод чырвонаармейцаў.

У Слуцк 14 г. мес. прыбыла эскадрцяжкіх самаходаў, прысланая з Гомеля. Ходзяць чуткі, што яны будуць высланы у найболей небясьпечныя сярodкі руху проці бальшавіцкага, які ўжо меў некалькі арганізацыяў, што ўзялі сабе за мэту зрабіць пераварот на абшары Усходняй Беларусі. У сувязі з гэтым наступіла адстаўка старшыні Рады Народных Комісараў С.С.Р.Р.

Непакой і перамены.

Сьледам за адстаўкай прэмьера Адамовіча і вайсковага павадыра Корка па загаду Масквы ідуць далейшыя адстаўкі. Нядаўна звольнілі вядомага дзеяча комуністычнай партыі Усх. Беларусі жыда Хацкевіча, прадстаўніка Беларусі ў Маскве. На яго мейсца назначаны Броўковіч.

Душаць комуністаў.

На апошнім тыдні ў мястэчку Рагачове нехта застрэліў заступніка начальніка Вокругу сьледчага Ураду В. Карпова. У сувязі з гэтым па прыказу Г. П. У. арыштавалі жыхароў Рагачова Пацеева і Плеваку.

Барацьба з сельсаветамі.

У Маскву надходзяць весткі аб выступленьні замажнейшага сялянства проці сельсаветаў, перавыбраных паміма волі грамадзянства. Выступленьні гэтыя носяць тэррорыстычны характар, нават даходзяць да пагромаў і падпалаў дабра старшыняў і членаў сельсаветаў.

Сярод кніжак.

(Крытычны агляд віленскіх беларускіх літэратурных навінак 1926 году.)

Нядаўна, яшчэ некалькі гадкоў назад, існаваў у віленскай, беларускай прэсе добры, культурны звычай, выражаючыйся ў тым, што кожная навасьць у краіне літэратурнай зараз-жа была грунтоўна скрытыкаванай ў якойкольвечы з нялічных тады беларускіх газэт.

На спэцыяльную ўвагу заслугоўвалі тады абшырныя і фаховыя рэцэнзыі п. п. Навіны і Сулімы.

На жаль, усьцяж разгараючаяся, хваробітае распалітыкаваньне беларускага грамадзянства, ня стоючае ў ніякой прапорцыі да ягоных здабыткаў на ніве культурнай, хутка зглушыла гэтыя сымпатычныя праявы і вось, на нашых вачох, рэцэнзыі літэратурных крытыкаў пачалі рабіцца што раз то больш рэдкімі, кароткімі, а творы драбнейшыя на'т зусім прамоўчываліся! Тымчасам беларускі выдавецкі рух ня толькі што ня зьменшыўся, але — зусім зразумела — разросься, перавысіўшы ў апошнім 1926 годзе ўсялякія спадзяваньні, а ў сёлетнім годзе выяўляючы моцныя тэндэнцыі да далейшага ўзросту!

Вось-жа заклікаючы ўсе беларускія газэты ў Вільні, (ня кажучы ўжо аб часопісях літэратурна-мастацкіх, якія маюць тутака спэцыяльныя абавязкі), да зьмяшчаньня хоць бы сабе і кароткіх, *але абавязкава з кожнага новага твору*, (на'т найменшага) якія ёсьць неабходнымі дзеля нармальнага разьвітку беларускае літэратуры. Спрабуем мы тымчасам, у гэтым нашым артыкуле даць кароткі, крытычны агляд віленскіх, беларускіх, літэратурных навінак 1926 году.

Калі-б гэты агляд выклікаў нейкую (зразумела, утрыманую ў культурных рамках!) палеміку з боку якога, інакш ацэніваючага маючыя тут быць разгляданымі творы, беларускага крытыка, нічога апрача здаволеньня, ад гэткага ажыўленьня ў беларускай літэратурнай крытыцы, яна-б у нас не пакінула.

У нашым аглядзе з 30-ці беларускіх кніжак, выйшаўшых у мінулым годзе мы агранічымся выключна толькі да твораў літэратурных, якіх будзе каля 10-ці, вось яны:

I. Поэзія.

1) „*Чарку дай, брацъ...*" — поэмка К. Сваяка.

2) „*Байкі*" (па Крылову і іншых) — Б. Друцкага.

3) „*Śmiech nia hrech*" — гумарыстычныя вершы Ст. Станкевіча.

4) „*Дэмон*" — поэма М. Лермонтова; пераклаў М. Краўцоў.

5) „*Дванаццаць*" — поэма А. Блока; пераклаў І. Гудок.

II. Проза.

6) „*Бартэк пераможнік*" — новэлла Г. Сенкевіча; пераклаў М. Краўцоў.

III. Драматычныя творы.

7) „*Ня розумам сьцяміў а сэрцам*" — п'еса ў 4 актах — К. Вясёлага.

8) „*Выбары старшыні*" — мэлодрама ў 3 дзеях Я. Быліны.

Акрамя гэтага выйшлі ў 1926 г. у новым выданьні „*Сцэнічныя творы*" Л. Родзевіча, абыймаючыя тры ягоныя, вельмі популярныя, аднаактаўкі: 1) Зьбянтэжаны Саўка", 2) „Пасланец" і 3) „Конскі партрэт", вызначныя здаровым, сялянскім гумарам і спэцыфічным лексыконам, якіх аднак тут разглядаць ня будзем, як творы ўжо ня новыя.

А цяпер пяройдзем да агляду паасобных твораў.

I. „Дай чарку, браце!... — поэмка К. Сваяка.

Невялічкая поэмка гэтая, лічучая ўсяго 13 старонак дробнага фармату, выдана, ліпше ўжо эканомна як на гэткі цікавы твор, выяўляе не малыя літэратурныя вартасьці і зьяўляецца вельмі характэрнай для творчасьці К. Сваяка.

Аўтар апявае ў ей історыю няшчаснага каханьня маладога студэнта з вясковай дзяўчынай, якую ў канцы зглуміў нейкі ваенны.

Есьць у гэтай паэмцы шмат характэрных для Сваяка філёзофічных разважаньняў, ёсьць прыгожыя, поўныя глыбокага настрою, малюнкі беларускае прыроды, ёсьць містыцызм... прачуцьці.. верш-гладкі, гучны, паважны...

Падзелена паэмка на чатыры часткі, ахрышчаныя найменьнямі паасобных пор году.

Вось для прыкладу вельмі прыгожы, абвеяны дэлікатнай мэланхоліяй, малюнак восені (ст. 8):

„О восень, восень — сьмерці ўяўленьне'
„Восень — пажоўклай прыроды грабніца.
„Восень - поэта ў засьвет лятуценьне,
„Восень—запеваў вятраных тайніца..
„Колькі ты сьвежых магіл адчыняеш,
„Колькі ты сьлёзаў горкіх разьліваеш!"..

Як ведама галоўнай тэмай творчасьці К. Сваяка, маючага ня толькі свой уласны стыль, але і арыгінальны, цікаўны слоўнік, зьяўляюцца матывы *рэлігійныя* і *патрыятычныя*; акрамя таго можна яго разглядаць і як: гумарыстага, „народніка", тонкага імпрэсыяніста, але найбольш цікаўным праз сваю зложанасьць і найменш дасьледжаным у ягонай творчасьці зьяўляецца, бяз сумліву, элемэнт любоўны.

Вельмі паказальным з гэтага боку ёсьць наступны адрывак, разгляданае праз нас поэмкі (ст. 3):

„Розум мой біўся з думкаю адною,
„Што сэрца неяк наўзгад дыктавала:
„Ці жыці трэба на век сіратою
„Адным на сьвеце, ці каб дапаўняла
„Лёс мой жыцьцёвы любая дзяўчына,
„Спрадвечнай „язьні" маей палавіна".

У іншым йзноў мейсцы гэтага-ж твору (ст. 12) знаходзім цьверджаньне, што: „шлях з жанчынай ёсьць грэхам мужчыны".

Устрымоўваючыся покульшто ад сапастаўленьняў і вывадаў у гэтай краіне з увагі на тое, што ня ўся яшчэ літэратурная спадчына па Сваяку апублікавана друкам, адзначым толькі, што поэмку гэту трэба залічыць да лепшых твораў Сваяковых.

ФІНАНСЫ і ГАСПАДАРКА.

Заграничныя даугі і пазыка Польшчы.

Адзіным ратункам для Польшчы ў цяперашняй крытычнай эканамічнай сытуацыі зьяўляецца заграничная пазыка, аб якой і вядуцца ў апошні час перагаворы з амэрыканскімі капіталістамі. Калі разабрацца добра ў наступіўшай нястачы збожжа, якое цяпер прывозіцца з заграніцы, дык і ў гэтым выпадку у тым, што прычына ня была зроблена заграничная пазыка, якая насыціла бы унутраны грашовы голад краю. Калі-б у краі быў адпаведны лік вольных грошаў, дык ня трэба было бы сьпяшыць з вывазам збожжа за граніцу дзеля атрыманьня чужаземнай валюты, як для падтрыманьня курса злотага, гэтак сама і ўплаты падаткаў. Грошы гуляюць у дзяржаве гэтакую самую ролю, як чырвоныя галачкі ў арганізме чалавека, нястача якіх выклікае малакроўе, хваробу арганізму і нават сьмерць. На жаль ня ўсе палітыкі аддаюць сабе ў гэтым поўны рахунак і не самым верным шляхам падходзяць к выражэньню гэтага пытаньня.

У аднашэньні заграничнай пазыкі ў нас істнуюць два кірункі: Адзін, на чале якога стаіць быўшы міністр скарбу Уладыслаў Грабскі, трымаецца таго пагляду, што па магчымасьці трэба абходзіцца без замежных грошаў. А калі і рабіць пазыку, дык толькі на самых карысных варунках. Другі кірунак, прадстаўляемы прагрэсыўна-дэмакратычнымі элемэнтамі, склонны ісьці на большыя ўступкі. толькі бы атрымаць салідную пазыку, якая дала бы таўчок усяму жыцьцю. Да маёвага перавароту перамагаў першы кірунак, а пасьля пераваротy—другі. Але ўжо было трохі запозна. А ўрад маршалка Пілсудскага, заняты ўнутранай санацыяй дзяржавы і барацьбой з рэакцыяй не скарыстаў вельмі карыснай гаспадарчай сытуацыі летам мінуўшага году і не зрабіў пазыкі на выгадных варунках, што цяпер зусім немагчыма. Давялі да самага апошняга мамэнту, калі і гандлёвы баланс амаль пасыўны, і дрэнныя віды на новы ўраджай, і дарагоўля ў краі і стыхійныя катастрофы ў Амэрыцы, фінансавы крызіс у Японіі і г. д., і калі, значыць, менш маецца вольных капіталаў у Амэрыцы і больш на іх спрос на сусьветным граш вым рынку.

На сколькі ўся наша фінансавая палітыка да гэтай пары была неправідлова і шкадліва, гэта відаць з прыкладу іншых эўрапэйскіх дзяржаваў, якія маюць большы дзяржаўны вопыт і практыку. На найбольшую ўвагу з нашага боку заслугуе Нямеччына, якая не саромілася варункамі і брала пазыкі, дзе толькі магла, пракананая, што кожная з іх ўпоўне аплачвае сябе і яшчэ дае зыск. Пасьля вайны яна пазычыла ў Амэрыцы і эўрапэйскіх дзяржавах больш аднаго мільярда даляраў. Нават маленькая 7 мільённая Аўстрыя і Бэльгія атрымалі значна большыя пазыкі, чым Польшча, ня лічачы старых даўгоў. Наш страх перад пазыкамі тым больш незразумелы, што нашы даўгі ў параўнаньні з даўгамі ўсіх іншых дзяржаваў зусім малыя, у той час як натуральныя скарбы дзяржавы даволі вялікія.

На першага студня гэтага года заграничныя даўгі Польшчы былі наступныя: Амэрыцы—213 мільёнаў даляраў, Францыі—1 мільярд франкаў (папяровых), Англіі — 1 мільён фунтаў штэрлінгаў, Італіі — 454 міл. ліраў, Швэцыі—6 міл кронаў, Швэйцарыі—88,000 швэйц франкаў, апрача гэтага на падставе інсбруцкага пратаколу Польшча прыняла на сябе пасьля распаду Аустрыі частку Аўстрыяцкага доўгу ў разьмеры 66 міл. гульдэнаў і 23 мільёнаў залатых кронаў. Затым дзяржава гарантавала пазыкі рожным гарадам і прадпрыемствам у агульнай суме 325 міл. залатых злотых, 16 міл. даляраў і 2 міл. ф. шт. Але і гэта па сраўненьні з іншымі дзяржавамі можна лічыць за вельмі малыя даўгі. Гэтак Бэльгія, напр., аднэй Амэрыцы вінна 480 міл. дал. і нядаўна пазычыла яшчэ 100 міл. даляраў. Аўстрыя атрымала ад восені 1925 г. да пачатку гэтага году ў Амэрыцы 135 міл. дал. Амэрыцы вінны: Англія—1 мільярд фунт. штэрл. ці 5 мільярдаў даляраў, Францыя—686 міл. ф. шт., Італія—400 міл. ф. шт. Затым Англіі вінны: Францыя—623 мільёна ф. шт., Расея—722 міл. ф. шт., Італія—610 міл. ф. шт., Юга-Славія—28,5 міл. ф. шт., Румынія—24,7 міл. ф. шт.

Ці прыходзіцца пасьля гэтага гаварыць, як неабаснаваны наш страх перад заграничнымі пазыкамі, маючы гэтакі малы доўг у параўнаньні з іншымі дзяржавамі. У нас на кожнага жыхара прыходзіцца ў сярэднім толькі 13 даляраў заграничных даўгоў разам з дзяржаўнымі паручыцельствамі, а чыстага дзяржаўнага доўгу толькі 70 зл., у той час, як на кожнага бэльгійца—1,400 зл., француза—3,000 зл., англійца—400 зл. і г. д. За тое ў нас менш усяго маецца і гатоўкі ў абароце. У гэтым аднашэньні Польшча займае самае апошняе мейсца ў Эўропе, ня лічачы аднэй Літвы. Грашовае абрашчэньне ў рожных дзяржавах прадстаўляецца гэтак: Галяндыя—234 зл. залатых, Англія—213,5, Швэйпарыя—213,1, Францыя—204,5, Бэльгія—171,5, Аўстрыя—98,2, Нямеччына—90,1, Чэха-Славакія—80,7, Польшча—19,6, Літва—17,9 зл. Дзяржаўны бюджэт прадстаўляе большую суму, чым маецца ў абрашчэньні ўсіх грошаў. Гэткім чынам пакуль сабяруцца ўсе падаткі, грошы зробяць некалькі кругаваротаў між скарбам і плацельшчыкамі падаткаў. Вось дзеля чаго падаткі раскладаюцца на раты. Словам—дзяржаўны арганізм хварэе грашовым малакроўем. У гэта хварабліва адчувае на сабе кожны з нас.

S

Крэдыты для земляробства.

22 сакавіка 1927 г. адбылося паседжаньне нагляднай Рады Дзяржаўнага земляробскага Банку, на якім між іншым пастаноўлена пашырыць крэдытную акцыю банка. Пастаноўлена ўвясьці часова доўгасрочныя крэдыты на ўплату даўгоў і інвэстыцыі для тых земляробаў, якія з поваду неурэгуляваньня гіпотэк ня могуць пакуль што карыстацца крэдытамі ў закладных лістах. Пазычкі гэтыя пакуль што будуць выдавацца пад закладныя лісты, дзеля чаго атрымліваючыя іх асобы забавязаны ў працягу года па атрыманьні пазычкі прадставіць пасьведчаньне адноснага гіпатэчнага аддзелу, што падалі заяву аб урэгуляваньні ці атрыманьні гіпатэкі. На гэтыя пазычкі наглядная Рада вызначыла пакуль 3 міл. зл.

Затым прыняты праэкт зьмены абацэнцы зямлі пры выдачы пазычак у закладных лістах, а ласьне шляхам павышэньня ацэначных цэн і новы падзел эканамічных вакругоў, праэкт гэты будзе прадоўжаны для зацьверджаньня міністрам скарбу, земляробства і зямельных рэформаў.

У справе прымяненьня льготаў пры выдачы пазык у закладных лістах прыняты прадпісаньні, дазваляючыя прымяняць льготы толькі ў выпадках выключных труднасьцяў даўжнікоў.

На крэдытную акцыю для земляробства улепшаючым насеньнем Рада вызначыла суму ў 1,800,000 зл. Крэдыты гэтыя будуць вызначаны ў разьмеры розьніцы цаны насеньня ўлепшаючага збожжа іі для ежы вытворцам насеньня на вэксал, выдаваныя на 9 месячны час

Нарэшце вызначана 100,000 зл. на крэдыты для „Кулэк“ і „ральнічых т-ваў“ пры па купцы радыявых апаратаў, што будзе мець вялікае значэньне пры частых лекцыях і камунікатах аб земляробстве.

Апрача гэтага Наглядная рада пастанавіла панізіць процант крэдытаў земляробскага банку да 9% пры ўчоце для цэнтральных інстытуцыяў коопэратыўных, $9^3/_4$% для коопэратыўных гмінных касаў і 10% для прадпрыемстваў некоопэратыўных. Для іншых крэдытаў працэнтная стаўка будзе крыху вышэйшая.

Біржа.

Даляры	8,94—8,90 зл.
Рублі зал.	4,63 зл.
Рублі сяр.	2,72 зл.
Чырвонцы	32,75 зл.

Збожжа

(Варшава)

Жыта (100 кілагр.-6 пудоў)	56 зл.
Пшаніца „ „	65 зл.
Ячмень брав.	—
Ячмень крупяны	48—51 зл.
Авёс „ „	48—39 зл.

(Віленшчына)

Жыта (100 кілагр.)	— — 43, — зл.
Пшаніца „ „	— 60 — 63, — зл.
Ячмень браваровы	50 — 52 — зл.
Ячмень крупяны	48 — 50 — зл.
Авёс „	— — 52,— зл.

Маленькі фэльетон.

Кавалі нашае долі.

У Праве-Чэскай, у клініцы заграничнае партыі беларускіх эсэраў адбываўся надзвычайны кансыліум...

На чарзе—пытаньне аб новым „бюлетэні“...

Малады дакладчык—былы хатні доктар па ўнутраным хваробам хворай—нэрваваўся і пытліва пазіраў на сваіх калегаў...

Цяжар справы быў ня ў тым, што хворая можа памёрці—бо дзякуючы яе маладому і моцнаму арганізму ёй не пагражала раптоўная сьмерць, ня ў тым нават, што галоўны кіраўнік аховы яе здароўя, прыслаўшы кароткую дэпэшу—„змагайся, як магазможаш“—сам раптам „зьменавехнуўся“—а ўсё была ў тым, што даючы „бюлетэнь“, яны, як пазамежныя дактары і ўжо доўгі час адарваныя ад хворай, ня ведалі ў дасканальнасьці ні цяперашняе яе хваробы, ні спосабаў яе лячэньня і дзеля гэтага маглі міма волі памыліцца і замест „ура“ закрычэць „караул“..

Але нават і ня гэта непакоіла іх, а нешта зусім іншае, і яно трывожыла дакладчыка: перашкаджала распачаць „кансультацыю“...

— Але-ж трэба пачынаць—падумаў ён—і расправіўшы пяцярнёй свае „кудры русыя да плеч“, устрахнуў імі і папрасіў цішыні...

— Дык вось... паважаныя калегі і таварышы—пачаў ён—у той час, калі ў імпэрыялістычна-буржуазна—нэпа—абшарніцкіх ідэалах угадова-авантурніцкія элемэнты і нудна-плаксівыя рамантыкі ў рэчаістым эгаізьме сэзанова-заалягічнага шавінізма імкнуцца, аўтарнікамі і зьбянтэжанымі інтэлігэнтамі і ў хцівасьці інвазнае экспансыі...

— Што гэта ён тамака гавора?!..

— Я штосьці нічога не разумею?!...

— І я?... І я?!..

— А ці ня можна ясней?!..—пачуліся галасы.

— Выбачайце, калегі?..!—замітусіўся дакладчык—але жы мы, як народнікі!..

— Калі мы народнікі, дык і кажны так каб народ разумеў—адазваўся з задніх радоў адзін з прысутных канавалаў, які гэтак сама быў блізкі да кансыліума...

— Але-ж, выбачайце! Я імкнуўся...

— Бліжэй, таварыш да справы! Нам трэба аб хваробе і лякарству!—ізноў пракрычаў канавал...

Дакладчык, выбіты з прыгатаванае прамовы, занэрваваўся і утрахнуўшы ізноў сваімі кудламі, пачаў далей...

— Калі для вас, калегі, народніцкая мова не зразумелая, дык калі ласка, я магу і на звычайнай ..

— Просімо! Просімо!..

— Дык пераходжу да нашага „бюлетэня“... Але перад гэтым, як мы распачнем разглядаць рэцэпты і паставім свой дзіагназ, я лічыў бы патрэбным ўстанавіць вам у памяці гісторыю паўстаньня хваробы і далейшае ейнае разьвіцьцё...

— Валяй браток, але карацей!..

— І каб было ясьней, бяз рожных вучоных выкрунтасаў!..

— Дык вось, як вам ёсьць ведама, пасьля няўдалае апэрацыі ў Рызе, праробленай хаця ж і спрактыкаванымі хірургамі, але без нашага ўдзелу і дапамогі—нашая страдаліца, як мы і спадзеваліся, заняпала на не вядомую для нас хваробу, званую нашымі закардоннымі калегамі—Арыентацыяй... Мікроб гэнае хваробы намі фактычна яшчэ ня ўлоўлены і не дасьледжаны.. Але тыя нашыя калегі дарогаю трудных досьледаў высьвятлілі, што „ен пачатак свой бярэ ў паветры, у кірунку...

— Куды вецяр дзьме?!—ускрыкнуў канавал...

— Але, але, таварыш! Уласьне—ў кірунку, куды вецяр дзьме... А пасьляператварыўшыся ў яшчэ меншыя мікра-арганізмы ён разгнездзжываецца пераважна ў чырвонцах, залатоўках ці ў літах...

— А ў далярах?!—спытаўся нехта...

— І ў далярах.. але гледзючы праз чыя рукі яны пераходзяць... І вось, калі гэтыя мікробы апануюць той ці іншай часьцінай арганізма нашае хворай—яе раптам пачынюць хапаць нейкія падрыгі, пасьля быццам ўздуваецца неяк і пачынае хіляцца то на ўсход, то на захад—у залежнасьці ад таго—з чырвонцаў яны ці з залатовак...

— А можа яна з голаду пухне?!—пачуўся чыйсь голас..

— А па пойму... калі пухне—ня ўтрымаўся і перабіў дакладчыка канавал—дык трэба кровушкі крыху спусьціць...

— Ці можа лепей піявак паставіць—ўмяшалася і цётка-знахарка, якая так сама была запрошапа па нараду...

— Прабавалі — адказаў дакладчык...

— А ці ня Лістапад гэта прабаваў?!...

спытаўся нехта ў задох...

— Але!. і ён, і іншыя... Што-жа датычыць піявак, дык і бяз гэтага яны сасуць яе колькі хочуць...

— А можа — падняўся пажылы доктар — можа трэба спрабаваць патэнтаваны сьродак — „мэмарыялам“ завецца... Вось, калі добра накарміць, дый...

— Што вы?! Што вы?!.. Паважаны ка-

І. Байкі (па Крылову і інш). — Б. Друцкага.

Ужо некалькі гадоў зьмяшчае Б. Друцкі свае творы ў гумарыстычных і літэратурных аддзелах газэт (раней у „Грамадзкім Голасе“, цяпер у „Беларускім Слове“), але да апошняга часу яны не друкаваліся асобнымі кніжкамі і толькі ў леташнім годзе прычакалі мы першага ягонага зборніку.

Зборнік гэты, фармату паменшанай васьмёркі, лічыць 32 страніцы і выданы хоць скромна, але старанна.

На спэцыяльную пахвалу заслугоўвае ўпрыгожаньне кніжкі шматлікімі і ўмела падабранымі ілюстрацыямі, гэтак рэдкімі наагул у беларускіх выданьнях.

Зьмест зборніка абыймае 16 баек, пераважна тлумачаных з Крылова.

Пераклад — у большасьці — свабодны, лёкалізаваны, дзеля чаго, у адносінах да аўтара, можна слова „пераклаў“ замяніць тэрмінам „зьбеларушчыў“, што агулам бяручы, ёсьць н'ат пажаданым.

З памянутых вышэй 16-ці баек найлепш удаліся Б. Друцкаму тры вялікія байкі: 1) „*Воўчы закон*“ (ст. 4), 2) „*Даніна*“ (ст. 6) і 3) „*Хвосьцік*“ (ст. 29); гэтак-жа вельмі добра выйшлі: „Конь і сабака“, 2) „Оўцы і сабакі“, 3) „Аслы“, 4) „Ваўкі і оўцы“, 5) „Млынар і куры“, 6) „Выбарнае начальства“, 7) „Асёл“, 8) Дуб і гарбуз“, 9) „Прарок“, 10) „Сабачы звычай“, 11) „Нос і ногі“, за тое верш „Што бачыў ў горадзе Кандрат?“, (ст. 23) у некалькіх мяйсцох шурпаты, а байка „Індык“, (ст. 11), дык і зусім неапрацавана; у ей, асабліва ў першай частцы яе, дык — казаў той — „парог“ на „парогу“, якіх тут на'т ня вылічаем, каб не займаць лішне мейсца, за тое спынімся праз момант на найважнейшых недахопах найлепшых вершаў, а гэтак-жа на ўступным „Конь і сабака“, які найбольш кідаецца ў вочы, хоць і трудна ткі зразумець, чаму неракладчык высунуў яго на першае мейсца, калі ў зборніку ёсць шмат іншых лепшых за яго, хоць напрыклад: „Сабачы звычай“ (ст. 27). Восьжа прадусім ў вершы гэтым пасьля слоў „Каб із двара цябе прагналі“ павінна быць цірэ, а не кропка, якая зьмяняе ўвесь сэнс, але гэта быць можа карэктарскі недагляд; далей у радку: „І гэтак ні мінуты спакою я не знаю“, тонічнасьць нацягнутая, бо калі пасьля слоў „І гэтак ні мінуты“... ня зробім штучнае паўзы, дык робіцца „парог“; гэтакжа трэ' адзначыць, што рыфмоўка „...кажаш ты“ з „...варты“ ёсьць лішне ўжо сьмелай!

З недахопаў трох найлепшых вершаў адцемім гэткія: ў байцы „Воўчы закон“ (ст. 4) ёсьць тонічны „парог“ у радку: „Быццам не дае яно яму напіцца“ лепш было-б: „Што, быццам не дае яно яму напіцца“, або „Што не дае яму вады напіцца“; у байцы „Даніна“ (ст. 6), слаба выйшла канчатковаа мораль: ізноў тут маем дачыненьне з гэткімі рыфмамі як „...парадак“ і „...падатак“, а ў першым радку: „Ня толькі у зьвяроў а й між нас“, павінна быць замест „й“—„і“: ўрэсьце ў „Хвосьціку“ (ст 29) ў радку: „З піскам прэцца парасё“, дзеля гучнасьці і захаваньня разьмеру, добра б было, карыстаючыся „навінкамі“ д-ра Я. Станкевіча замяніць „з“ на „із“ або „ізь“, ці калі гэта не да ўспадобы, перарабіць неяк інакш.

У групе добрых вершаў варта-б было перапрaвіць мораль у байцы: „Оўцы і сабакі“ (ст. 9): да радку „Кепска калі ёсьць за шмат апекуноў“, ізноў жа дзеля гучнасьці і захаваньня разьмеру, трэ' дадаць ў пачатку „ой“, ці нешта у гэтым родзе.

Вельмі псуе ўражаньне ад зборніку неакуратная карэкта, у рэзультаце якой у шмат якіх мяйсцох замест гэтак важнага ў беларускай паэзіі „ў“ кароткага маем „у“ даўгое і наадварот; тое-ж самае, толькі ў меншай меры, можам сказаць і аб блутаньні „і“ з „й“

Спыняючы на гэтым нашыя крытычныя ўвагі адзначаем, што затрымліваліся мы гэтак падрабязна над кожнай, мо' падчас і дробнай, хібай зборніка не таму, каб знайсьці г. зв. „дзіру ў цэлым“, а таму толькі, што лічым яго вельмі цэнным здабыткам у гэтай галіне беларускай літэратуры і хацелі-б, каб у ІІ-гім выданьні, якога — раней ці пазьней ён пэўне ж дачакаецца, аўтар ухіліў усі істнуючыя ў ім заганы.

Пераходзючы да агульнай ацэнкі творчасьці Б. Друцкага адзначым, што пісаны яны добрай, беларускай мовай; мова іх вобразная, жывая і сакавітая; так што калі аўтар ня будзе ленавацца і возьме сябе ў рукі, дык можа заняць з часам даволі выдатнае мейсца ў беларускай літэратуры.

Як мы чулі, аўтар мае ўжо гатовыя да друку новыя байкі (перакладныя ды-й арыгінальныя), а гэтак жа іншыя яшчэ поэтыцкія творы, якія трэ' было-б выдаць асобнай кніжкай.

Задача гэта зьяўляецца моральным абавязкам Т-ства „Беларуская Хатка“.

Канчаючы гэтым агляд „Баек“, прывядзем тут дзеля прыкладу вядомую кожнаму яшчэ са школьнай лавы і дасканальна перакладзеную байку: „Сабачы звычай“:

„Праз вёску раз прыйшлі два йшлі
„І гутарку паважную вялі.
„Аж раптам тут з пад падваротні,
„Сабака кінуўся на іх.
„За ім другі, там больш. І ў міг —
„З усіх двароў сабак зьляцелася паўсотні.
„Кідаюцца, ірвуць,
„Зусім праходу не даюць.
„Адзін з прыяцеляў кія шукаць пачаў.
„Пакінь“ — другі яго ўстрымаў.
„Кіем сабак ты ня уймеш,
„А толькі болей раззлуеш.
„Натуру я сабачу знаю,
„І свой на злосьць іх спосаб маю:
„Спакойна пойдзем і на зьвягу,
„Зьвяртаць ня будзем мы увагу.
„Яны йшчэ крыху пазлуюцца,
„ Пабрэшуць ды і разьбягуцца.
„І праўда: чым ішлі далей,
„Брахня ставалася цішэй;
„Па аднаму сабакі заціхалі,
„А за ваколіцай — зусім атсталі.

„Людзкая злосьць такі жа звычай мае:
„Усё незнаёмае ды значнае — брахнёй
варожай спатыкае.
„Калі аднак на брахуноў увагі не зьвяртаць
„ — Перастаюць брахаць.“

(Працяг будзе)

Я. Сьветазар.

лега! — пачаў адмахвацца рукамі дакладчык — перапрабавана! Ад „мэмарыяла“ яшчэ больш пухне!..

— А калі нашая хворая — зноў ўмяшаўся канавал — возьме, дый выздаравее?!...

— Як гэта?! — пачалі пераглядацца іншыя...

— А проста.. гэтак сама па сабе... як той казаў — сваім ўнутром... возьме дый ўсё і пераможа... А мы тутака будземо сівараць кансыліумы, кансультацыі, даваць „бюлетэні“, а яна — на табе! — возьме дый бяз нас і выздаравее!

— Ці можа хто з тамтэйшых дактароў знойдзе нейкі спосаб, дык гэтак сама бяз нас і вылячыць яе — падтрымала яшчэ некалькі галасоў канавала... — Няхай Бог крые?! — ускрыкнула цётка-знахарка.

І гэтая думка канавала і кусьнула дакладчыка ў самае хворае мейсца, і тое „іншае“, што гэтак трывожала яго ўсплыла вонкі...

— Ну і канавал?! — падумаў дакладчык — дагадаўся такі?!.. Дык як-жа калегі — пачаў ён нэрвавацца — бяз бюлетэня-ж ня будзе?!.. Прасіў бы вас, тутака даглядзець рэцэпты, дый і дзіагназ..

— Далоў старыя рэцэпты?!..

— Годзі! Ня трэба іх?!.. Давай новыя!

— Дык можа, паважаныя калегі, запросімо рады ў Сашкі?!.. — трос сваімі „кудламі“ дакладчык...

— Што?!...Керэншчыну? Далоў?!... Вон!...

— Паршывую анучку?!...

— Гнаць вас усіх трэба?!...

І ня было бы новага „бюлетэня“, але якраз у гэты момэнт, быццам па нейкаму прачуцьцю, прынясьлі пакет ад.. закардоннага калегі... І толькі глянуўшы на почарк дакладчык закрычэў — ура...

Гэта быў камунікат п. Татунькі і „бюлетэнь“ быў гатоў.

Г—ка.

Вільня.



Від на Вільню. На першым пляне Місыянарскі касьцёл.

Тутэйшая хроніка.

Катэдра беларускай культуры ў Віленскім Унівэрсытэце. Саюз студэнтаў—Беларусаў віленскага Унівэрсытэту падаў ў Сэнат Унівэрсытэту просьбу аб установе спэцыяльнай катэдры Беларускай Культуры, даводзячы, што Віленскі Унівэрсытэт, які абымае сваей культурнай працай вялікі абшар засялённы Беларусамі, ня можа абыйсьціся без спэцыяльнай працы над беларусазнаўствам.

Новыя таргі. Віленскі Ваявода пазволіў адчыніць 9 г. мес. таргі ў Аранах павету Віленска-Троцкага і Галубічах, пав. Дзісьненскага. Таргі будуць у гэтых местах што аўторак.

Чэстэртон у Вільні. Вядомы англійскі пісьменьнік Чэстэртон, будучы у Польшчы, прыезджае на днях да Вільні.

Паездка Ваяводы п. Рачневіча ў павет Ашмянскі. Ваявода віленскі п. Рачкевіч 11 і 12 г. месяца выезджаў да Ашмяншчыны на інспэкцыю

У Альшанах Ваявода ў таварыстве кс. Бодзькі заходзіў на адбудову касьцёла, а таксама ў царкву. Настаяцель царквы Юзьвюк падзякаваў Ваяводзе ад імя праваслаўнага народу за апеку.

У гмінах Сольскай, Крэўскай і Смаргонскай, якія найбольш зьнішчаны ў часе вайны, Ваявода даў настаўленьне датычна адбудовы Пазычка на гэтую адбудову ўжо ўрадам прызначана.

Галоўным чынам зьвярнуў Ваявода ўсюды ўвагу на адбудову, адносіны гаспадарскія і направу дарогаў.

Падаткі безпасярэднія У гэтым месяцы належыць плаціць падатак ад нярухомасьці (будынку, зямля і г. д.) за першую чэцьверць г. года Падатак гэты можна ўнасіць аж да самага канца траўня.

Арышты Навагрудзкіх комуністаў. Недаўна ўлада публічнае бясьпекі зьліквідавала цэлы рад комуністычных ячэяк ў Навагрудчыне. Сябрамі гэтых ячэяк былі па большай часьці жыды. Нібы заняўшыся гандлем, вялі яны шпікоўскую работу на карысьць СССР.

6 г траўня паліцыя зьліквідавала саюз комуністычнай моладзі ў Лідзе Арыштавана 5 асобаў. Арышты таксама былі зроблены ў павеце Лідзкім і Валожынскім, у Жолудку, у Шчучыне 8 г. траўня арыштавана ў Ражанцы сэкрэтара комуністычнай ячэйкі Укоўскага Чэскеля, які прызнаўся, што гэтая сетка комуністычных ячэяк істнуе ад году 1925. Пачатак гэтым арганізацыям даў нейкі Арон Анфэльберг.

Комуністычная ануча на слупе Ноччу з 15 на 16 г. траўня на тэлеграфны слуп па дарозе з Гарадзея да Нясьвіжа быў павешаны комуністычны сьцяг з напісам па беларуску і жыдоўску. Мясцовыя жыхары сарвалі гэтыя анучы і аддалі паліцыі.

Пісьмо у рэдакцыю.

Паважаны Пане Рэдактар!

Ветліва прашу зьмясьціць гэтых некалькі словаў.

У № 41 дармовай газэткі „Сял. Ніва“ ад 14 траўня г. г. пад шумным загалоўкам „Дэфэнзыўная праца“ лейб-махэры з пад знаку „Абман—Саюва“ зьмясьцілі як заўседы фальшывую брахню і дурную лаянку на паважанага пана Старшыню Бел. Нац. Рады,— да якога прыхільнасьць і сымпатыі жыхароў нашага павету з кожным днем усё балей і шырэй растуць, доказам чаго ёсьць цьвёрды факт, што выдатныя беларускія дзеячы, якія дагэтуль трымаліся здалёка ад ўсіх партый, цяпер **адкрыта ўступаюць ў рады „Прасьветы“ і Бел. Нац. Рады,** каб весьці ідэйную працу пад нацыянальным сьцягам сваей Бацькаўшчыны. Што з гэтым сухім фактам ў хуткім часе махэры Сельсаюза будуць лічыцца, мы цьвёрда пэўны.

Ў падзагалоўку „Понімаете-лі“? платны прафэсыянальны брахун „Сял. Нівы“ надта добра бароніць карэспандэнта Кваса, які не адзін раз цалаваў сталёвы замок расейскай турмы за зладзейства і грабёж, а цяпер ёсьць у нашай гміне „Рэфэрэнтам“ конскіх справаў, толькі бяда яму, бо жыхары добра сочаць за кожным яго крокам і дзьверы замком, як толькі зьявіцца, зачыняюць.

Zastępcu конскага рэфэрэнта, верн га прыяцеля „Кваса“ па ўсім „інтымным“ справам жыхары забілі ў лесе, дагнаўшы са скрадзеным к нём!

Чы варта, Сельсаюзьнікі, бараніць свайго кумпана, які вас толькі скампрамітаваў у вачох сялян Міжэвіцкай, Дзевяткоўскай і Чамерскай гмінаў!?

Старая праўда бярэ сваё: Які пан, такая крамка!

Адносна Белькевічаў і Каленкевічаў, якіх паважна зьбіраецца бараніць і апраўдаць з бандыцкага хуліганства праф-брахун „С. Нівы“—цяпер даводжу да ведама, што гэтыя маральныя забойцы душ тутэйшых сялян— цяпер ўжо ёсьць пад судом.

Для комуністычных хуліганаў і дэманстрантаў—мейсца ў нас німа!

Далей праф.-брахун жаліцца, што: „паўлюкевічаўцу—шпіку ня мілыя Бельокевічы, Каленевічу?. Пытаюся ясна, каротка

„Чы мілыя Сельсаюзу хуліганы з чырвонымі сьцягамі, на якіх выпісаны былі ў расейскай мове комуністычныя клічы—ідучыя 1 траўня адкрыта па вёсцы з „Інтэрнацыяналам“ на беларуска-селян-саюзьн. вуснах?

Чы мілыя вам гэтыя прыяцелі? Калі так,—віншуем!

І што датычыцца выражэньня на шпальтах нуднай газэціны „Сял. Нівы“—„аднак жа ад кандыдата (Кваса-карэсп. С. Нівы) да запраўднага забойцы, якім ёсьць Баначкоўскі“,. трэба выясьніць што, карэспандэнт „Сял. Нівы“, які хаваецца пад псэўдонімам „Квас“— быў і ёсьць ведамы ў нашай гміне хуліган „пассэр-конскі“, які вельмі цёмныя справы вядзе цяпер з тыпамі—якіх мэта адна: красьці коні і пускаць у ход да Зэльвы, чы Дзярэчына—„na urlop cygański“.

Што датычыцца таго, быццам я забойца, —то жыхары тутэйшай гміны добра ведаюць „справу забойства“ майго—быў гэты нешчасьлівы выпадак ў 1925 годзе, 4 красавіка, ў Міжэвічах, пры 15 прысутных сьведках, мейсцовых сялян, якія пасьля **на судзе баранілі меня,**—хаця мне гэта абарона была зусім непатрэбна—дзеля таго, што справа была вельмі ясна, і сцьверджала сьведкамі так аднэй, як і другой стараны (праціўнай), якія пасьведчылі пад прысягай, што гэта была выключна неасьцярожносць, без злой волі і трудна было прадбачыць рэзультат.

Суд, бяручы паказаньні сьведкаў пад увагу, засудзіў мяне за неасьцярожнае захаваньне з аружжам па 464 ст к. к. і аднача сова маючы на ўвазе, што раней **я не быў ніколі пад судам, на пру аднаго месяца** „zawiesił w wykonaniu na 2 lata“—і цяпер тэрмін гэты кончыўся, а **кара аўтаматычна** „umorzona“.

Бедныя сельсаюзьнікі! Нешчасны „рэдактар“ ні мае чым запоўніць сваей брахлівай газэціны і піша вялікае „забойства“—здарэньне з 4/IV 25 г.—заместа даваць сьвежыя, бягучыя навіны, — сваім, нелічным чытачам! Адкуль ўзяць новае—калі ніхто з разумных сялян пісаць ня хоча да „Брахл. Нівы“— Трэба грэць старую гарбату!

З пашанай Баначкоўскі.

Жыцьце провінцыі.

Партрэты сельсаюзьнікаў.

(*Слонімшчына*)

Вядомая рэч, што комуністычныя агітатары заўсёды стараюцца апанаваць істнуючыя, легальныя арганізацыі, каб пасьля ў характэры сяброў гэных арганізацый без ніякай шкоды для сябе, весьці „сваю працу“.. Што так было і ёсьць цяпер — шмат фактаў з кожнага дня дае пацьверджаньне тут сялянам, якія інтэрэсуюцца крышку палітычным жыцьцём наагул, а сваей гміны асабліва.

Пасьля развалу „Грамады“, штаб падраённ. камітэтаў К. Б. З. Б. пачаў шукаць якай-небудзь арганізацыі, каб пад яе вывескай можна было ў супакоі весьці комуністычную працу і далей баламуціць сялян.

Кампавія заядлых грамадзістаў у в Варонічы, Слонімск павету,—адразу мяняе сваё аблічча і робіцца... „ідэйнымі сельсаюзьнікамі“.

Цешыцца беднае сэрца Ярэмы et Ругалы, што больш сябраў аднэй вёскі ўвайдзе ў пусты дагэтуль ворак парт-сель-саюза!.

Заварушылася ў рэдакцыі „Сель Нівы“: пачалі дарма высылаць газэтку, а тут справа кепска! „Ідэйныя сельсаюзьнікі“ 1 га траўня г г. вышлі на вуліцу вёскі Варонічы з чырвоным сьцягам і надпісамі ў расейскай мове: „Слава III Інтэрнацыяналу“, „Далой буржуазны строй“.

Каб сельсаюзьнікі—Ругала і Ярэма маглі паверыць, што хнія „дзеткі“—нова хрышчоныя „саюзьнікі“ ў Варонічах, Слонімск. пав. пэўна выдаючы сябе за за „гарачых сымпатыкаў Сельсаюзу“—пайшлі ў комуністычным напрамку і заместа беларускага нацыянальнага сьцягу—йшлі па вуліцы з чырвоным, абвешаным комуністычнымі клічамі — падаю тутака прозьвішча гэтых запраўдных маскоўскіх хуліганаў—забойц ў душы Беларускага Народу:

1) Бэгер Міхась, (сядзеў ў турме за „конскую палітыку“)

2) Бэгер Мікалай, ведамы ў нашай вёсцы зл дзей.

3) Буляніца Янка, прафэсыянал—п яніца, нарыў нашай вёскі.

4) Жолудзь Сьцяпан, 5) Мацыновіч Базыль, экспэдытары чужых картофель.

6) Каленевіч Лявон (платны б агітатар „Грамады“, ня раз сядзеў ў „гатэлю“.)

Цяпер гэты сельсаюзьніцкі тавар сядзіць ў Слонімскім вастрозе і намерываецца хутка выйсьці адтуль.

Ось, браткі, які элемэнт запаўняе дзіравыя шэрэнгі Ярэм—партыі, якая нам, вяскоўцам дагэтуль, апрача пекных фразаў са шпальтаў „Нівы“ — нічога добрага не дала і не дасьць! Праўда — дасьць гэта фальшывая партыя карысьць але не нам, сярмяжнікам бедным, а толькі Ярэмічу — пасольскі мандат і яшчэ новы дамок...

Няхай Ярэмічы пакуль што не думаюць, што ў мутнай вадзе — сваей кепскай праграме — будуць рабіць кар'еру на сялянскіх мазалях.

Ведаем добра, хто вы, адкуль і што нам можаце толькі абяцанкі даць, — ведаем!

Агіднае, ажырэлае ваша цела нямае душы, каб спачуваць нашай, няшчаснай долі.

Прыйдзе дзень, згінуць Ярэмічы са сваімі дамкамі.

Прэч з дарогі, злыя сілы..

Я. Галіна.

Нашыя сельсаюзьнікі.

(*Слонімшчына*)

Маленькая крамка — музэй палітычных банкротаў пад „салідная“ фірмай: „Сельсаюз“ мае цікавыя „тыпы“, якія трэба паказаць грамадзянству Беларусі, хацяў „партрэце“ з тае прычыны, што „арыгінал“ пакуль-што дорага цэніцца і яго добра пільнуюць тутака.

Ось ён: „ідэйны саюзьнік“, знае добра праграму і статут Сельсаюзу, жыхар вёскі Сьвіраны, Малчадскай гм. Слонімск. павету, Сымон Руды, паводле акта абвінавачаньня ў справе № К. 471/26—так выглядае:

... „сцьверджана, што з ініцыятывы Г.П.У. у Менску, пры пасрэдніцтве беларуск. паслоў, бучучых у цеснай сувязі з сэкрэтаром радавага пасольства Кубецкім, і Цэнтр. Камітэтам К.П.З.Б. ў Вільні, жыхар вёскі Сьвіраны, Малчадзкай гм., Слонімскага пав. Сымон Руды, арганізуе на тэрыторыі Слонімск. павету, асабліва ў Малчадскай гміне... комуністычна-дывэрсыйную банду...

Сымон Руды ўступіў на службу да Менскага Г.П.У. ў тым часе знаходзяцца рапарты Рудога аб яго арганізацыі, абаружжы і трэбаваньне аружжа

Мэта банды была:

1) фармір ваць дывэрсыйны атрад, 2) старанне аб дабычы аружжа, 3) весьці агітацыю.

Чы не пекны партрэт Сельсаюзу?.

А мо, са злосьці Ругалы-Ярэмы лопнуць, — а мо' запярэчаць, што гэта не іхні быў „шчыры сымпатык“

Сыстэматычна насіў ён і праграмку і статуцік „Вялікай Партыі Самахвалаў“—якія нічога сялянам не далі, апрача поўнай кішані „пекных“, палітычных прамоваў.

Паны Ярэмічы і ваша кумпанія! Даволі ўжо нашаму сялянству дурыць галаву толькі пекнымі славамі!

Сьвіранец

КАНФЭРЭНЦЫЯ Беларускай Нацыянальнай Рады.

У дні 22 траўня ў Вільні ў памешканьні Беларускай Хаткі (Zawalna 6, m. 4) адбудзецца канфэрэнцыя сябр ў Беларускай Нацыянальнай Рады.

Парадак канфэрэнцыі:

1. Справаздача за год.
2. Выработка праграмы і статуту.
3. Даклад з мейсцаў.
4. Бягучыя справы.

Віхор у Ашмянскім павеце.

17 г. траўня каля гадзіны 14 у Дзевяніцкай гміне Ашмянскага павету ўзьняўся сільны віхор.

У вёсцы Селюкі зьнішчыў ён дамы, хлявы, гумны ў сямі гаспадароў. Ранена шэсьць асобаў. Адзін конь і два парсюкі забіты.

У вёсцы Шадзюны адна гаспадарка зьнішчана саўсім; дзевяць гаспадарак пацярпела вялікую шкоду, зьнішчана таксама гаспадарка лясьніка ў Пальтуцёве. Панішчыў віхор засевы, сады, пчолы, студні, прыватныя і дзяржаўныя лясы.

Ашмянскі стараста выехаў на места шкоды дзеля абгледзінаў.

УСЯЧЫНА.

„АРКОС“.

„Аркос“ — гэта цэлая бальшавіцкая крэпасьць на тэрыторыі Англіі, якую ў апошні час мусіла здабываць англійская паліцыя. Пад гэтай назовай разумеецца англійскае гандлёвае акцыянэрнае таварыства, заснаванае ў чэрвені 1920 г. і падлягаючае англійскім законам Самая назва паўстала з пачатковых літараў „All Russian Cooperative Society“—што значыць „Усерасейскае Коопэратыўнае Таварыства“

„Аркос“ купіў сабе 6 гадоў таму назад у Лёндане некалькі сумежных будынкаў на вуліцы Моргатэ, якія выходзяць і на другую вуліцу Кольман Гэтая сыстэма дамоў зьяўляецца найвялікшымі і найпрыгажэйшымі забудовамі у гандлёвай часьці Лёндана, званай Сыты. А дзеля таго, што службовы пэрсанал Т-ва складаецца выключна з радавых грамадзян лікам да 1,000, дык радавы Урад зусім апанаваў гэтымі будынкамі, захапіў іх пад сваю апеку, перабудаваў і пасяліў там сваё гандлёвае прадстаўніцтва, (торгпрэд), якое карыстаецца на моцы англа бальшавіцкага гандлёвага дагавору правамі экстэрытарыяльнасьці (недатыкальнасьці.) З кл давы капітал гэтага т-ва недасягае аднаго мільёна фунтаў.-штэрлінгаў, у той час як радавы Урад патраціў на перабудову гэтага будынку больш міль на фунтаў штэрлінгаў (10 мільёнаў залатых руб.) Адсюль відаць, што бальшавікі трацячы гэтакую вялізарную суму грошаў на перабудову гмаху, мелі на ўвазе зусім не гандлёвыя мэты, якія наагул мала іх цікавяць. Між рожнымі патаёмнымі хадамі, складамі ў мурах і інш. мелася 7 асобных абітых сталью пакояў, да якіх у часе вобыску англійскай паліцыі бальшавіцкі пэрсанал адмовіўся даць ключы. І англійская паліцыя, якой было прыказана зрабіць вобыск з мэтай н ходкі важных ваенных дакумэнтаў, выкрадзеных з ваеннага міністэрства і якія па ўсім д ным павінны знаходзіцца ў „Аркосе“ бо ніткі ўсіх зладзействаў вядуць да „Аркаса“, як да клубка, мусіла браць гэтую крэпасьць штурмам.

Былі прывезены спэцыяльныя гэтак званыя пнэўматычныя машыны, пры помачы якіх прабіваліся грубыя сьцены з стальнымі панцэрнымі абшыўкамі ўнутры. У аднэй з такіх жалезных камэр быў знайдзены доўгі стол і навокал мягкія канапы, дзе праўдападобна адбываліся паважныя тайныя паседжаньні і рабіліся загаворы. Адсюль відаць што „Аркос“—гэта ў сутнасьці было не гандлёвае таварыства, а панцэрная бальшавіцкая крэпасьць на тэрыторыі Англіі, якую прышлося „штурмаваць англійскай паліцыі.

Апарат пры помачы якога можна хадзіць па вадзе.

Жыхар Варшавы Сьвідэрскі выдумаў апарат, які дае магчымасьць хадзіць на вадзе ня гледзячы на тое, якая ёсьць глыбіня вады, або як быстра вада цячэ. Увесь апарат важыць ня больш як два кілё і можа зьмясьціцца ў кішані пальто.

Адказны Рэдактар Т. Вернікоўскі. Друк. І. Баеўскага Вільня, Біскупья 12. Выдавец Беларуская Нацыянальная Рада.